Сацыяльная кансультацыя

Дзелім водпуск на часткі

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны адказваюць на вашы пытанні.

Калі ў службу занятасці звяртаецца чалавек з інваліднасцю па дапамогу ў працаўладкаванні, ці абавязкова пры гэтым прадставіць індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда?

— Так. Рэгістрацыя грамадзян у якасці беспрацоўных з'яўляецца адміністрацыйнай працэдурай. У адпаведнасці з Пералікам адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян (зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 года № 200), пры звароце для рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага чалавек з інваліднасцю павінен прадставіць сваю індывідуальную праграму рэабілітацыі.

Без прадстаўлення гэтага дакумента наймальнік, згодна з артыкулам 26 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, не мае права прыняць інваліда на работу і заключыць з ім працоўны дагавор.

* * *

Ці можна водпуск, які даецца работніку-інваліду, падзяліць на дзве часткі?

— Згодна з часткай першай артыкула 174 Працоўнага кодэкса, па дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам працоўны водпуск можа быць падзелены на дзве часткі, калі іншае не прадугледжана калектыўным дагаворам, пагадненнем. Пры гэтым адна частка павінна быць не меншая за 14 каляндарных дзён.

Заканадаўствам не ўстанаўліваюцца абмежаванні для якіх-небудзь катэгорый работнікаў, у тым ліку для людзей з інваліднасцю, па падзеле водпуску на часткі. Такім чынам, працоўны водпуск работніка, які мае інваліднасць, можа быць падзелены на часткі ў парадку, устаноўленым часткай першай артыкула 174 Працоўнага кодэкса.

* * *

Ці можа быць падоўжаны сацыяльны водпуск без захавання заработнай платы, калі ў яго перыяд работнік захварэў і яму быў выдадзены лісток непрацаздольнасці?

— Не, не можа. Падаўжаецца або пераносіцца ў сувязі з надыходам часовай непрацаздольнасці работніка толькі працоўны водпуск (артыкул 171 Працоўнага кодэкса).

Але пасля закрыцця лістка непрацаздольнасці работніку можа быць дадзены чарговы сацыяльны водпуск ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

Што ў кашальку

«ПАДУШКА» БЯСПЕКІ

Як траціць грошы з розумам?

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Ці заўсёды мы рацыянальна распараджаемся сваімі сродкамі? Бо як бывае — атрымаеш аванс, зарплату, а праз нейкі час ужо амаль пуста ў кашальку, дакладна і не згадаеш, куды колькі патраціў. Безумоўна, ёсць пункты расходаў, якія абавязковыя і паўтараюцца з месяца ў месяц. А вось калі размова заходзіць пра нечаканы бальнічны, зламаны тэлевізар ці абед з калегам, то тут якраз і ўзнікаюць траты, на якія не разлічвалі. Таму вядзенне бюджэту — гэта наш арыенцір у пытаннях фінансаў сям'і.

Існуюць розныя варыянты вядзення сямейнага бюджэту. Аднак не блытайце спосабы захоўвання сродкаў («канверты», «збанкі», «50/20/30») і фіксавання выдаткаў (ручны ці з дапамогай праграм на камп'ютары ці тэлефоне). Зрузумела, кожны з іх мае свае асаблівасці, перавагі і недахопы. Пачнём з самага простага — ручнога спосабу ўліку. Для яго спатрэбіцца сшытак і ручка: проста запісваем, што атрымалі і куды патрацілі, а ў канцы месяца падводзім вынікі і аналізуем. Асноўная заўвага — усе падлікі трэба таксама рабіць уручную, без прывязкі да камп'ютара і інтэрнэту.

Ведаю тых, хто аддае перавагу мабільным ці камп'ютарным уліковым праграмам. Сама была прыхільніцай такога варыянта, пакуль не «пачысціла» памяць у тэлефоне. Выбар спецыяльных праграм надзвычай вялікі, але не заўсёды бясплатная версія адпавядае нашым патрабаванням: камусьці не хапае магчымасці весці разлікі ў розных валютах, для кагосьці не надта поўна адлюстраваны катэгорыі выдаткаў. Зручна, што дастаткова ўсталяваць праграму, і ў любы момант занатоўваеш паступленне грошай і траты, а потым у канцы месяца глядзіш, якім чынам іх можна аптымізаваць. Напрыклад, калі шмат грошай ідзе на інтэрнэт і мабільную сувязь — варта дабраць новыя тарыфныя планы.

Ад уліку пяройдзем да спосабаў размеркавання грошай у бюджэце. Адна мая знаёмая практыкуе метад «канвертаў». «Такі спосаб размеркавання мне найбольш імпануе. Бо як бывае? То забудзеш улічыць нейкую дробную пакупку, то зусім класічны выпадак — «заглючыў» тэлефон, і ўся інфармацыя знікла... Камп'ютарная ж праграма, якую на той час я знайшла для вядзення дамашняй бухгалтэрыі, не была разлічана на сям'ю з дзецьмі. Таму «канверты» аказаліся самай жыццяздольнай сістэмай, — дзеліцца Вікторыя. — У мяне іх шэсць: «побыт», «транспарт», «адпачынак», «абавязковыя плацяжы», у сезон — «нарыхтоўкі» і не так даўно з'явіўся яшчэ адзін — «форс-мажор», у яго мы адкладаем грошы на нейкія непрадбачаныя траты, дзе, напрыклад, набыццё лекаў, паход у цырульню і гэтак далей. Што да тых жа камунальных і іншых плацяжоў, тут я гляджу, якія трэба аплаціць наяўнымі, а на якія пакінуць грошы на картцы. Але ўсё фіксую яшчэ і ў спецыяльным блакноце. Таму ў канцы месяца маю наглядную карціну, куды і якія грошы ідуць».

Спосаб размеркавання бюджэту па «збанках» з'яўляецца варыяцыяй метаду «канвертаў». Грошы раскладаеце ў шэсць збанкоў. У першы — 55 % заробку на паўсядзённыя выдаткі і аплату розных плацяжоў. Другі — для адпачынку, і туды можна пакласці толькі 10 %. Калі гэтая сума будзе патрачана, то давядзецца шукаць бясплатныя магчымасці для адпачынку. Трэці збанок адводзім пад зберажэнні, і ў яго адкладваем зноў жа 10 %. Чацвёрты — выдаткі на адукацыю (курсы, кнігі — найлепшая інвестыцыя ў сябе), туды таксама ідзе 10 %. Збанок пад пятым нумарам будзе рэзервовым фондам, дзе назапашваем грошы штомесяц для нейкай вялікай пакупкі, напрыклад аўто, новай мэблі ці ноўтбука. І на іх адкладаць 10 % зароблених грошай. Нарэшце, шосты збанок — у яго кладзём 5 % — на падарункі і дабрачыннасць. Згадзіцеся, задача набыць прэзент на невялікую суму дае добры штуршок фантазіі.

Ёсць яшчэ варыянт, калі грошы размяркоўваюцца ў працэнтах у суадносінах 50/20/30: і калі палова заробку ідзе на плацяжы, ежу, праезд і іншыя важныя выдаткі, то зусім нечаканай з'яўляецца лічба 30 % у дачыненні да такой катэгорыі, як «адпачынак» (у гэтай канцэпцыі яна называецца «стыль жыцця» і мае на ўвазе ўкладанні ў сябе), а 20 % — на забеспячэнне сабе фінансавай незалежнасці ў перспектыве. Варыянт цікавы, але, на маю думку, не зусім практычны для сям'і.

— Калі казаць пра сямейны бюджэт, то ён мае чатыры функцыі: улік, аналіз улічанага, планаванне на аснове ўліку і аналізу ды кантроль за тым, як усё выконваецца. Планаванне будзе правільным у тым выпадку, калі маюць адлюстраванне ўсе функцыі. Спосабы для гэтага існуюць самыя розныя, варта спрабаваць і шукаць той, у якім вам будзе камфортна, — мяркуе **фінансавы кансультант Святлана МУРАШКА.** — На пытанне, наколькі важна планаваць і размяркоўваць сямейны бюджэт, адказ у кожнага свой. Бо нехта зарабляе дастаткова, каб ні ў чым сабе не адмаўляць, і гэта адна сітуацыя. А іншая — калі людзі маюць, напрыклад, нейкія крэдытныя абавязацельствы альбо ў іх ёсць мэта назбіраць на жыллё, вучобу дзецям: тады без планавання будзе складана. Усё індывідуальна, аднак чым раней людзі пачынаюць уважліва ставіцца да сваіх грошай, тым лягчэй ім будзе ў нейкія паваротныя перыяды жыцця (калі захварэлі альбо хочаце змяніць работу і г. д.). Бо чалавек, які мае фінансавую «падушку» бяспекі, заўсёды будзе адчуваць сябе больш упэўнена.

Алена ДРАПКО.

Прававая гасцёўня

ВЯРНІЦЕ МУЖА З ДАЧКОЙ!

«Мой муж — фін. На лета ён паехаў з нашай 10-гадовай дачкой адпачыць да сябе на радзіму. Пачалася школа, а яны так і не вярнуліся. Ён кажа, што Паліна прывыкла, збіраецца вучыцца ў Фінляндыі, вяртацца не хоча. Пагаварыць з ёй ён мне не дае. Ці можна прымусіць яго вярнуцца ў Беларусь разам з дачкой? Я ж не пагаджалася на тое, каб яна там засталася жыць».

Надзея М., Мінск

— Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года. Гэты дакумент скіраваны на забеспячэнне неадкладнага вяртання непаўналетняга ў краіну пастаяннага пражывання, калі ён быў вывезены адным з бацькоў у іншаземную дзяржаву з парушэннем правоў апекі або доступу другога з бацькоў, — тлумачыць **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Той з бацькоў, хто перамяшчае малога за мяжу без згоды другой «паловы», парушае права дзіцяці на стасункі з абодвума бацькамі, якое замацавана ў Канвенцыі аб правах дзяцей. Калі дамовіцца паміж сабой мірна не атрымліваецца, перш за ўсё дзеля інтарэсаў дзіцяці, пачынаюць дзейнічаць механізмы Канвенцыі.

Вы маеце права звярнуцца з заявай аб вяртанні дзіцяці, калі дзяржава, куды перавезлі дзіця, з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі. (Беларусь далучылася да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей у 1997 годзе.)

Форма заявы аб вяртанні дзіцяці змешчана на сайце Міністэрства юстыцыі («Дзейнасць» — «Міжнароднае супрацоўніцтва» — «Міжнародная прававая дапамога» — «Канвенцыя аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года»: https://minjust.gov.by/directions/international_cooperation/icd-lev2-4/icd-lev3-4).

Заявы і дакументы да яе павінны суправаджацца перакладам на афіцыйную мову дзяржавы, якая запытваецца. Пакет дакументаў трэба накіраваць у Мінюст для наступнай перадачы яго кампетэнтнаму органу іншаземнай дзяржавы, дзе знаходзіцца дзіця, альбо можна самастойна накіраваць іх адразу ў адпаведную ўстанову ў Фінляндыі.

Папярэджу, што адзін з бацькоў або асоба ці арганізацыя, якія маюць права апекі адносна дзіцяці, могуць звярнуцца з заявай аб вяртанні непаўналетняга пры адначасовым выкананні наступных умоў. Дзіцяці не споўнілася 16 гадоў. Перад вывазам за мяжу яно стала пражывала ў краіне — удзельніцы Канвенцыі і перамешчана ў іншую дзяржаву, якая таксама ўдзельнічае ў Канвенцыі. (Фінляндыя — удзельнік Канвенцыі, як і больш за 100 іншых краін свету.) На момант перамяшчэння правы апекі адносна дзіцяці ажыццяўляліся эфектыўна або маглі б здзяйсняцца, калі б малога не вывезлі.

Прымаючы рашэнне аб вяртанні, суды ўлічваюць такія моманты, як працягласць і перыядычнасць, умовы і прычыны знаходжання дзіцяці ў дзяржаве і пераезд сям'і ў гэтую краіну. Прымаюцца да ўвагі таксама нацыянальнасць малога, веданне мовы, сямейныя і сацыяльныя сувязі дзіцяці ў дзяржаве.

З дзесяці гадоў, дарэчы, суд ужо можа ўлічваць жаданне самога дзіцяці наконт таго, з кім з бацькоў яно хоча застацца. Разам з іншымі абставінамі меркаванне малога будзе ўлічвацца судом пры вынясенні рашэння.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. Разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.